І мы там былі

# ПРЫВІДУ НЕ ЧАКАЕЦЕ?

## Як у Мірскім замку ладзілі Калядны баль

**Маскарад у стылі ампір прайшоў напярэдадні старога Новага года ў музеі «Палацавы комплекс «Мір». За шыкоўнай імпрэзай назірала і наш карэспандэнт.**

Ды што там назірала — танчыла, колькі моцы ставала! У гэты вечар тут панавалі даўно забытыя, нават незвычайныя і дзіўныя ў сучасных умовах, але такія гарэзлівыя полька-тройка, паланэз, мазурка, падэспань і, канешне ж, кароль бальных танцаў — венскі вальс! Тыя, хто не надта валодаў танцавальнымі рухамі, маглі атрымаць неабходныя навыкі на месцы — майстар-класы, прызнацца, спатрэбіліся не мне адной. Але тое, што адбывалася пазней, апраўдвала ўсе высілкі — зала віравала пад гукі чароўнай музыкі!



Як расказаў **дырэктар музея «Палацавы комплекс «Мір» Алесь ЛОЙКА**, прыгожую традыцыю правядзення ў Радзівілаўскім замку баляў тут адрадзілі ў 2012-м, і яны адразу сталі карыстацца попытам — прыйшлося нават павялічыць іх колькасць, дадаўшы вясеннія і восеньскія імпрэзы. А яшчэ з'явіліся дзіцячыя святочныя балі. Але самым шыкоўным, бясспрэчна, лічыцца Калядны баль-маскарад, да якога рыхтуюцца загадзя, абдумваючы вобраз у дэталях... Каб увесь час захоўваць навізну, кожны раз абіраецца новая тэматыка: раней прайшлі Венскі баль, імпрэзы ў стылі 20—30-х гадоў мінулага стагоддзя.

Сёлета арганізатары прапанавалі баль-маскарад у стылі ампір з адпаведным дрэс-кодам: дамам — сукенка «да падлогі», пальчаткі, абутак на нізкім абцасе, кавалерам — строгі касцюм (смокінг ці фрак), гальштук-бабачку і зноў жа пальчаткі. І, безумоўна, — добры настрой і маскі для ўсіх! Які ж маскарад без іх?!

Паўдзельнічаць у гэтым балі госці прыехалі з усіх куткоў Беларусі, а таксама з Расіі і нават з Германіі і Вялікабрытаніі.

Галоўнай мэтай правядзення баляў, па словах суразмоўніка, з'яўляецца нават не камерцыйны складнік, а хутчэй асветніцкі: маўляў, гэта не проста старажытны замак, які пераўтварыўся ў прыгожы музей з цікавымі і дарагімі экспанатамі, а жывая ўстанова з інтэрактыўнай часткай. Сапраўды, музей можа мець і іншае аблічча, якое адрознівае яго ад усіх іншых. Жывым Мірскі замак робяць менавіта такія імпрэзы: назіраючы за тым, што адбываецца ў танцавальнай зале, часамі ўяўляеш, што ў гэтых старажытных мурах ажывае мінулае...



Дарэчы, на балі ажывалі не толькі вобразы, але... скульптуры і карціны — вось такую анімацыйную частку падрыхтавалі для гасцей арганізатары. Дух эпохі дапаўнялі салонныя гульні з XVIII стагоддзя: усе, хто жадаў, змаглі навучыцца гуляць у «Тру мадам» і «Гусь, якая збегла». Між іншым, гэтыя забаўкі па сваёй захапляльнасці маглі б скласці нядрэнную канкурэнцыю сучасным «настолкам». Словам, адчуванне, што ты перанёсся ў старажытныя часы, мяне, напрыклад, не пакідала ўвесь вечар. Не хапала толькі прывіду замка...

— Ведаеце, мы часам ладзім і такія «неспадзяванкі» для гасцей, што застаюцца на ноч у гатэлі, — расказалі ў адміністрацыі музея. — Калі нашы наведвальнікі чагосьці жадаюць, мы імкнёмся апраўдаць іх спадзяванні.

Між іншым, тут ладзяцца нават карпаратыўныя балі. Найбліжэйшым павінен стаць 23 лютага афіцэрскі, дзе вайскоўцы закружацца ў чароўным рытме вальса са сваімі дамамі сэрца.

**Вольга АНУФРЫЕВА, фота аўтара.**

# І Ў ВЯЛІКІМ — БАЛЬ

**Тэмай дзясятага навагодняга балю ў Нацыянальным акадэмічным Вялікім тэатры оперы і балета Беларусі стаў раман Гастона Леру «Прывід оперы». Раманатычны герой гатычнага рамана на адну ноч пасяліўся ў тэатры: цуды пачыналі адбывацца адразу ж, на балі, які традыцыйна адкрыў гэты вечар. Цікавыя хады і тэатральныя рашэнні, заснаваныя на містыфікацыі, ілюзіі, таямніцы, загадкі — у такой чароўнай атмасферы сустракалі стары Новы год удзельнікі балю.**

**Таццяна ТКАЧОВА.**



Пад заслону

# ПАРАД ТЭНАРАЎ ЛА СКАЛА І БЛІСКУЧЫ ТОМ СІНАТРА

## Сенсацыяй сёлетніх «Вечароў» стаў італьянскі гітарыст

**Чуткі аказаліся неперабольшанымі, Том Сінатра, які ўваходзіць у першую дзясятку гітарыстаў свету, зачараваў брэсцкую публіку. Яго неверагоднае музычнае майстэрства ў спалучэнні з харызмай сталі падзеяй фестывалю.**


Том Сінатра.

Яшчэ перад першым канцэртам музыкант даў невялікую прэс-канферэнцыю для прадстаўнікоў сродкаў інфармацыі. Расказаў, што дома ў яго захоўваецца 27 гітар. Яны выкарыстоўваюцца ў адпаведнасці з тым, якія творы трэба выконваць. А яшчэ ён іграе на скрыпцы, раялі, мандаліне. Але ў Брэст Том узяў адну гітару, якую і пацалаваў на першым вечары пасля таго, як публіка ўзарвалася шквалам апладысментаў. У першы вечар ён абяцаў выканаць адзін твор, як той казаў, для запеўкі. Таму пасля паклону са сцэны забралі крэсла, на якім сядзеў музыкант. Але ён не разгубіўся ў адказ на шчырыя апладысменты — пашукаў вачыма, дзе сесці, сышоў на другую прыступку, сеў на краёчак сцэны і прадоўжыў віртуозную ігру. Ён ва ўсім падаваўся сціплым: ну зусім няма зорнай хваробы ў чалавека. Арганізатары на папярэдняй прэс-канферэнцыі расказвалі: ніякіх асаблівых умоў для пражывання не агучвалася, што для зоркі яго ўзроўню выглядае дзівам. Ну і потым, калі журналісты прасілі за кулісамі адказаць на пытанне, Сінатра нікому не адмаўляў. І трэба было бачыць, як пасля канцэрта яго акружылі дзяўчаты для здымкаў! І як задаволеныя мужы шчоўкалі тэлефонамі, калі Том абдымаў і хіліў да сябе іх шчаслівых жонак! Вось з гэтага, відаць, і складаецца харызма.

Музыкант прыляцеў у нашу краіну па бязвізе з Варшавы. У яго хутка пачынаюцца вялікія гастролі па ЗША. Сказаў, што яму спадабаўся Брэст, яму падалося, што ўсё тут дыхае культурай. Абяцаў прыехаць праз некаторы час зноў. І запрашаў у Італію наш сімфанічны аркестр. Аркестр, дарэчы, быў на сцэне, падчас першага выступлення Тома Сінатры. Аўтар гэтых радкоў з першага рада уважліва назірала за рэакцыяй прафесійных музыкантаў і бачыла на іх тварах і павагу, і захапленне. Іграў Том чароўна. У другі вечар на сваім заяўленым канцэрце быў яшчэ больш непасрэдна разняволены. Заспяваў вядомую песню з фільма «Хросны бацька». І трохі нават хуліганіў: сыграў губамі і языком на гітары вядомы хіт «Бесаме муча». Няцяжка ўявіць, якая атрымалася рэакцыя. А Том не разгубіўся, растрыбушыў кошык з кветкамі, які напярэдадні, падчас урачыстага адкрыцця, унеслі ў залу са словамі: «Кветкі ад губернатара», ды стаў кідаць хрызантэмы ў залу. Адным словам, падарыў многа кветак жанчынам... Думаю, губернатар не пакрыўдзіўся.

Ад многіх гледачоў давялося чуць у розных варыяцыях, што сёлетні фестываль «зрабілі італьянцы». І ў гэтым вялікая доля праўды. Тэнары «Ла Скала» Джані Манджардзіна і Альда Капута шмат разоў выходзілі «на біс». Парадавалі і расійскія оперныя выканаўцы з Вялікага тэатра Тамуна Гачашвілі, Вікторыя Каркачова, Алуда Тодуа, а таксама саліст Марыінскага тэатра Вадзім Кравец. Добрым геніем фэсту чарговы раз назвалі польскую спявачку Іаанну Наўрот. Яна, дарэчы, сказала, што прыехала ў Брэст чацвёрты раз, а калі запрасяць, прыедзе і пяты. Яе Сільва з аднайменнай аперэты Кальмана была чароўная.

«Вечары» падарылі гараджанам незабыўныя ўражанні і асалоду ад вечна жывой класічнай музыкі. Яшчэ перад адкрыццём старшыня Брэсцкага аблвыканкама Анатоль ЛІС адзначаў асаблівасць сёлетняга фестывалю, які Брэст сустракае ў год свайго тысячагоддзя ў статусе культурнай сталіцы СНД. А **намеснік міністра культуры Сяргей ШАРАМЕЦЬЕЎ** прыгожа назваў фестываль святам, якое саграе сэрцы ў калядныя дні, а таксама агучыў прывітальны адрас, дзе гаворыцца: «У горадзе з тысячагадовай гісторыяй замацаваліся традыцыі новай эпохі. Гэта перш за ўсё правядзенне мерапрыемстваў, якія маюць высокадухоўныя і высокамаральныя мэты. На працягу многіх гадоў брэсцкі фестываль «Студзеньскія музычныя вечары» карыстаецца вялікай папулярнасцю сярод аматараў класічнай музыкі, уносіць адметны ўклад у захаванне традыцый беларускага і сусветнага музычнага мастацтва».

**Святлана ЯСКЕВІЧ. Фота Аляксандра ШУЛЬГАЧА.**